Падтрымай "Вясну" на PATREON

На незалежную журналістку Тамару Шчапёткіну складзены пратакол

01.11.2017 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода слова



Тамара Шчапёткіна (злева) і Паліна Сцепаненка

Адміністратыўны пратакол складзены 31 кастрычніка на журналістку-фрылансера Тамару Шчапёткіну з Бярозы. Яна абвінавачваецца ў працы на замежнае СМІ – Беларускае Радыё Рацыя без акрэдытацыі па арт 22.9 КаАП.

У прыватнасці, як паведамляе Беларускае Радыё Рацыя, Шчапёткіна прысутнічала на судовым пасяджэнні па іску былога міліцыянта Кобрынскага РАУС, цяперашняга юрыста “Гарадзец-Агра” **Анатоля Джыгі** да даяркі гэтай гаспадаркі **Вольгі Сышчаніцы**. Пратакол складзены ўчастковым інспектарам Кобрынскага РАУС маёрам міліцыі **Юрыем Свідуновічам**, кажа Тамара Шчапёткіна:

> *– Я была выклікана ў Кобрынскі РАУС, дзе мне паведамілі, што супраць мяне рыхтуецца адміністрацыйная справа. Склалі пратакол за працу на замежнае СМІ на тэрыторыі Беларусі без акрэдытацыі. Я не згодна з пратаколам, паколькі лічу, што гэты артыкул закона „Аб сродках масавай інфармацыі” не тычыцца журналістаў, а тычыцца выданняў.*

Тамара Шчапёткіна неаднаразова была пакарана паводле артыкулу 22.9 ч. 2. – незаконны выраб і распаўсюд сродкаў масавай інфармацыі. Толькі за перадапошнія 2 гады агульны яе штраф па гэтаму артыкулу 12 мільёнаў рублёў. Яна лічыць гэта палітычным перасследам за яе працу па тэматыцы парушэння правоў людзей органамі ўлады. Справа будзе разглядацца ў Бярозаўскім судзе. Дата суда пакуль не прызначаная.

Твитнуть





ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"



#ВолюВясне

ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брэсце і Віцебску пасля рэйда па сацсетках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC Memorial
Anti-Discrimination Centre

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh











E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY